■ Кантрамарка

# МЫ ЛЮБІМ МАМУ І ЧЭХАВА

**Вы можаце адрозніць сапраўдную архідэю ад штучнай? Пасля спектакля Піпа Дэльбона мне здаецца, што людзі, якія бачаць вонкавыя адрозненні, спасцiглі сэнс жыцця. Але я такіх не сустракала... Міжнародная праграма форуму «ТэАрт» пачалася з аўтарскага тэатра, дзе драматургічнай асновай спектакля становіцца не п'еса ў звыклым для нас разуменні (злева — хто кажа, справа — што кажа), а асабістае выказванне рэжысёра. Ланцужкі асацыяцый і думак паядноўваюць любоў да маці і любоў да Чэхава, трукі на трапецыі і непазбежнасць смерці, надзвычайную прыгажосць і фізічную недасканаласць. Якое вашае апошняе моцнае перажыванне?**

## Караблекрушэнне ў чаравіках

Гэта не тэатр, гэта цырк. Дакладней, не зусім тэатр і новы цырк. Спектакль «Донка — пасланне Чэхаву» Даніэле Фінцы Паска — тэатральны мантаж асацыяцый-эцюдаў, прысвечаны славутаму драматургу. Яго могуць выканаць толькі цыркавыя артысты (настолькі дзеянне патрабуе фізічнай спрактыкаванасці). Акцёры Фінцы Паскі — гэта яшчэ і жанглёры, паветраныя акрабаты, гімнасты, клоўны. У ланцужку эпізодаў-карцін, які яны ствараюць перад гледачом, усплываюць то асацыяцыі з творамі Антона Паўлавіча, то з ягоным асабістым жыццём. Рэжысёр акцэнтуе ўвагу на тэме хваробы, слабасці чалавечага цела і сілы духу да развітання з жыццём. Вось чалавек круціцца ў коле пад даждом з чырвоных пялёсткаў. Божухна, які няўстойлівы гэты свет! А вось тры сястры спрабуюць утрымацца на трапецыі: моцныя, спрытныя, але ж без трывалай глебы пад нагамі...

Донка — гэта вуда з бубенчыкам. Фінцы Паска ўзгадаў і пра захапленне Чэхава рыбалкай. Акцёры нібыта выцягваюць адна за адной свае гісторыі-рыбіны і перажываюць: ці ўдалося нам сёння злавіць сапраўдную, здольную развярэдзіць душу? «Душа, — прызнаецца адна з выканаўцаў, — жыве ў чаравіках. Мы спрабуем зладзіць буру ў чаравіках». І гэта гучыць пэўным цыркавым парафразам знакамітага чэхаўскага: «Людзі абедаюць, толькі абедаюць, а ў гэты час складваецца іх шчасце і разбіваецца іх жыццё».

Бура і сапраўды здараецца. У фінале першага дзеяння перад гледачом з'яўляецца жырандоль з лёду, а пад ёй акцёры з ледзянымі шарамі ў руках. Пасля папярэдніх сцэн ніхто ў зале не сумняваецца ў іх майстэрстве жангліраваць, напачатку яны і сапраўды са спрытам гэта робяць. Але вось наўмысна разбіваецца адзін шар, потым другі, потым на сцэне з'яўляюцца іншыя ледзяныя прадметы і таксама б'юцца. У фінале, перад тым як быць канчаткова аслепленай сафітамі, зала бачыць, што акцёры разбіваюць жырандоль, ступаючы на крошыва з лёду басаног, без аніякіх чаравікаў.

## Дайце мне атмасферы!

Памятаеце пачатак фільма Андрэя Таркоўскага «Люстэрка»? Ігнат бачыць па тэлевізары, як доктар лечыць гіпнозам хлопца з моцным заіканнем. Некалькі разоў яна паўтарае яму: «Я магу гаварыць! Я магу гаварыць!» Пасля хлопец гаворыць. Такое метафарычнае сцвярджэнне ініцыяцыі ў грамадстве кожнага з нас і адначасова сцвярджэнне пэўнай творчай манеры для мастацкага выказвання. Нешта падобнае адбываецца з гледачамі



Сцэна са спектакля «Донка — пасланне Чэхаву».

Фота Наталлі КАШЭЎСКАЙ

і на спектаклі Піпа Дэльбона «Архідэі». Але механізм гіпнатычнага ўздзеяння надзейна схаваны ў двухгадзінным дзеянні і замест «гаварыць» у яго ўсталёна слова «адчуваць».

Піпа Дэльбона, паводле ўласнага прызнання, не любіць гэты свет, але іншага месца для таго, каб жыць, няма, і ён стараецца максімальна палепшыць умовы існавання. Перадусім навучыўшыся адрозніваць штучнае ад сапраўднага і спасцігнуўшы пачуццё любові.

Калі «Донка — пасланне Чэхаву» — гэта візіянерскі мантаж (мантаж візуальна прыгожых карцін), то апісаць структуру сцэнічнага выказвання Піпа Дэльбона куды больш складана. Гледачы то апынаюцца перад пустой цёмнай сцэнай і чуюць толькі голас рэжысёра, што распавядае ў мікрафон пра сучаснае захапленне чалавецтва гаджэтамі, пра ўласнае дзяцінства, пра сваю маці, нейкія выпадкі з жыцця. То назіраюць за рознымі відэашэрагамі (часам за кадрам ім чытаюць маналог з Чэхава, пасля маналог з Шэкспіра). То сочаць за дзіўным танцам. То становяцца сведкамі развітання рэжысёра з хворай маці, якое ён засняў на відэа і ўманціраваў яго ў спектакль.

Трансляваць, перадаваць такое асаблівае адчуванне свету змогжа не кожны акцёр, і трупа ў Піпа Дэльбоны таксама асаблівая. У адным з інтэрв'ю рэжысёр каротка апісаў яе частку: Бабо (да таго, як стаць акцёрам, ён 45 гадоў правёў у псіхіятрычнай клініцы, дзе і адбылося выпадковае знаёмства з рэжысёрам); Джанлука Баларэ, чалавек з сіндромам Даўна, вучань маці Піпа Дэльбоны; румынскі скрыпач; танцоўшчыца з Афрыкі і танцоўшчыца з Гранд-оперы. Калі ад гэтага пераліку ў вас склалася адчуванне пэўнай дабрадзейнасці рэжысёра, то давядзецца вас расчараваць: творчае крэда Піпа Дэльбоны — шчырасць. Так, бяздомны ці бежанец можа патрапіць у яго спектакль, але толькі ў тым выпадку, калі будзе цалкам адпавядаць шчырасці выказвання. Проста Піпа Дэльбона надзвычай адкрыты свету, і ў поле яго зроку можа патрапіць як чалавек з дыпломам тэатральнай школы, так і выпадковы мінак. І, здаецца, ён умее адрозніваць штучныя архідэі ад сапраўдных.

Але спектакль «Архідэі» — расповед не толькі пра штучнасць і сапраўднасць. Адной з галоўных гераінь пастаноўкі — маці рэжысёра — ужо няма на гэтым свеце. «Да таго ж «Архідэі» нарадзіліся з той вялізнай пустэчы, дзе я апынуўся, калі не стала маёй маці. Я больш не быў нічыім дзіцем. Ніхто больш мяне не любіў», — раскрывае таямніцу нараджэння ідэі пастаноўкі рэжысёр. Ён хоча вярнуць любоў: выходзіць на сцэну, танчыць — і падабаецца; гаворыць за сцэнай пра асабістае — і падабаецца. Але ж толькі падабаецца, бо ніхто ў гэтым свеце не здолее любіць яго так, як маці... Свет без мацярынскай любові малапрыдатны да жыцця, але што рабіць — іншага месца няма.

Пакутуючы ад уласнай неўладкаванасці, сутыкнуўшыся з немагчымасцю быць любімым сынам, Дэльбона выяўляе ў нас нейкую надзвычайную шчырасць, адкрытасць. Гледачы выходзяць з залы з упэўненасцю «Я магу адчуваць!» і абяцаюць сабе не згубіць гэтай упэўненасці, нават калі прыйдзецца ісці басанож па лёдзе.

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ**

---

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# РАБОТЫ Ў САДЗЕ Ў КАСТРЫЧНІКУ



Фота Наталлі КАШЭЎСКАЙ

**У гэты час трэба праводзіць вільгацезарадны паліў кустоў і дрэў, бо ўвосень адбываецца ўзмоцнены рост і ўмацаванне каранёў. Багаты запас вільгаці ў глебе засцерагае пладовыя і ягадныя культуры ад зімовага падмярзання.**

Аптымальныя нормы на дарослае дрэва ў засушлівую восень:

• Груша і яблыня — 30—40 вёдзер.
• Сліва і вішня — 15—20 вёдзер.
• Парэчкі і маліна — 5—6 вёдзер на 1 квадратны метр.

Таксама ў кастрычніку трэба правесці асноўную падкормку кустоў і дрэў фосфарна-калійнымі і арганічнымі ўгнаеннямі. Пры сумесным унясенні норму фосфарна-калійных угнаенняў памяншаюць удвая. Усе гэтыя ўгнаенні трэба ўносіць пад перакопку. Пры ўнясенні вадкага каравяку або фекальных мас трэба браць 5 кілаграмаў такога ўгнаення на 1 метр разоры. Вакол дарослага дрэва трэба зрабіць 2 такія разоры глыбінёй 10 сантыметраў. Першую ў радыусе 1-1,5 метра ад штамба, а другую — па праекцыі існуючай кроны дрэва. Фосфарна-калійныя ўгнаенні таксама можна ўносіць у гэтыя разоры.

Садовыя суніцы карысна падкарміць попельным шчолакам ці хаця б проста пасыпаць глебу ў міжраддзях попелам. Для прыгатавання попельнага шчолаку трэба ўзяць 2 шклянкі попелу на 10 літраў вады і дабавіць у раствор марганцоўкі для дэзынфекцыі. Попельны шчолак можна таксама выкарыстоўваць і для падкормкі дрэў.

Для перакопкі глебы ў прыствольных кругах і каля кустоў лепш выкарыстоўваць вілы, а не рыдлёўку, каб пры гэтым паверхневыя карані менш пашкоджваліся. У маліны і абляпіхі глебу не трэба перакопваць увесь год, у тым ліку і ўвосень, а толькі трохі ўскалупнуць і замульчыраваць перагноем ці торфам. Габлюшкі, салому, пілавінне выкарыстоўваць для мульчыравання восенню не трэба, бо яны прыцягваюць мышэй.

У кастрычніку завяршаюць пасадку пладовых дрэў — груш, яблынь, абляпіхі — і ягадных кустоў. Саджанцы слівы і вішні лепш прыкапаць ў нахіленым становішчы (зімняя прыкопка). Калі вы набываеце саджанцы грушы і яблыні пасля 20 кастрычніка, то іх лепш таксама прыкапаць на зіму. Гэта трэба рабіць на самым высокім месцы садовага ўчастка. Паўночную сценку трэба зрабіць вертыкальнай, а паўднёвую — спадзістай. Глыбіня канаўкі — 50-60 сантыметраў. Саджанцы трэба раўнамерна раскласці, карані засыпаць зямлёй ці пяском і паліць. Пры надыходзе пастаянных замаразкаў штамбікі саджанцаў трэба прысыпаць зямлёй.

Перакопку глебы паміж прыствольнымі кругамі трэба праводзіць без разбіўкі пласта зямлі, лапатай. Глебу восенню не барануюць, бо трэба, каб буйныя пласты зямлі лепш прамерзлі. Пры гэтым назапашваецца неабходная вільгаць і гінуць многія шкоднікі раслін, якія зімуюць у глебе.

Работы ў садзе ў кастрычніку павінны быць накіраваны і на барацьбу са шкоднікамі. На грушах і яблынях часта развіваецца парша, якая пашкоджвае лісце і плады, а ў груш і галіны. Як толькі ападзе ўсё лісце, трэба на зямлі апырскаць яго растворам мачавіны (700 г на 10 л вады). Саму крону дрэва нельга апырскваць гэтым растворам.

Дуплы, якія ўтварыліся ў старых дрэвах, трэба ачысціць ад мёртвай драўніны, прадэзынфікаваць 3-працэнтным растворам меднага купарвасу ці 5-працэнтным растворам жалезнага купарвасу і замазаць цэментавым растворам.

# ЯДОМЫЯ ХРЫЗАНТЭМЫ

**Мы прывыклі бачыць у хрызантэме толькі вельмі прыгожую кветку. Як дэкаратыўная культура яна вядомая з глыбокай старажытнасці. Асабліва любяць і шануюць хрызантэму ў Кітаі і Японіі. Менавіта там з'явіліся і яе ядомыя формы. Цяпер хрызантэма як агародніна, зялёная расліна з рэзкім смакам, шырока вядомая не толькі на Усходзе, але і ў Амерыцы, Еўропе, у апошнія гады яна з'явілася ў Расіі, а магчыма, неўзабаве дабярэцца і да нас.**



Агародная хрызантэма — аднагадовая расліна. Сцябло дасягае 1 м вышыні. Лістоў шмат, яны падоўжанай формы, мясістыя, перыстараздзельныя, зялёныя, з тонкім водарам. Кветкі — адзінкавыя, даволі буйныя, жоўтыя ці белыя. Зацвітаюць (адразу па некалькі кветак) прыкладна праз месяц пасля ўсходаў. Перыяд цвіцення працяглы — больш за два месяцы. Агародная хрызантэма — пластычная расліна, у нашых умовах можа вырошчвацца і ў абароненым, і ў адкрытым грунце. Яна холада- і засухаўстойлівая, але вельмі святлалюбная. Размнажаецца насеннем. Можа расці на рознай глебе, але аддае перавагу лёгкай.



Расліны ядомай хрызантэмы жыццеўстойлівыя, з высокай аднаўленчай здольнасцю — пасля абрывання лістоў хутка адрастаюць новыя. У Кітаі яе называюць «бясконцай раслінай».

Пасевы можна праводзіць у адкрыты грунт з ранняй вясны, але можна і пазней, бо гэта хуткаспелая культура — гатоўнасць да выкарыстання ў ежу наступае праз месяц пасля пасеву. У гэты час збіраюць далікатныя галінкі. Калі затрымацца з уборкай, галінкі грубеюць, а ў ежу выкарыстоўваюць лісты і кветкі.

Пры неабходнасці атрымаць насенне сеюць рана ці высаджваюць расаду. Для фарміравання насення гэтай хрызантэме патрабуецца ад 130 да 190 дзён. У адкрыты грунт насенне сеюць на градкі радком на адлегласці 55-70 см. Пасля з'яўлення ўсходаў, калі расліны падрастуць, іх прарэджваюць, пакідаючы паміж імі 25-30 см. Выдаленыя сеянцы выкарыстоўваюць для ежы.

Догляд хрызантэм просты і звычайны: праполкі і рыхленні. У ежу ўжываюць маладыя парасткі, лісце і кветкі чатырох відаў, часцей за іншых — увянчаную і мнагалістую. У Японіі і Кітаі існуе цэлы шэраг сартоў ядомых хрызантэм і рэцэптаў іх прыгатавання. Для нас гэтая культура новая, і пакуль нават у Расіі няма яе айчынных сартоў, але там ёсць ужо пэўныя формы.

Хрызантэма можа служыць дыетычным прадуктам харчавання. У яе лістах і кветках змяшчаецца шмат бэта-каратыну, вітамінаў $B_1$, $B_2$, PP, C; акрамя таго, там спрыяльны састаў мікраэлементаў: калій, кальцый, прысутнічаюць фосфар, натрый, жалеза. Лісце валодае спецыфічным прыемным пахам і пікантным смакам. Кветкі выкарыстоўваюцца не толькі ў ежу, але і для ўпрыгожвання страў.

Агародную хрызантэму добра ўжываць у сырым выглядзе (у салатах) разам з іншай гароднінай; у якасці прыправы; можна дабаўляць у супы, адварваць, тушыць і смажыць.

У Японіі пры выкарыстанні ў ежу кветак ядомай хрызантэмы іх спачатку вымочваюць у воцаце з цукрам. Суквецці валодаюць аздараўленчымі ўласцівасцямі: павышаюць устойлівасць да неспрыяльных умоў навакольнага асяроддзя, служаць прафілактычным сродкам супраць узнікнення ракавых захворванняў.

---

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

АСІНА — прыгожае, стройнае ліставое дрэва, з якім у народнай культуры было звязана нямала рэгламентацый.

◈ Лічылася, што асіна «крадзе» (паглынае, забірае да сябе) энергію чалавека. Разам з тым асіну — яе галіны, дошкі з яе або завостраны асінавы кол, так званую «Перунову паліцу» — выкарыстоўвалі ў якасці моцнага абярэга ад нячыстай сілы. Так, каб засцерагчы ад яе гумно і хлеў, падчас будаўніцтва ў сцяну паміж бярвёнаў абавязкова клалі некалькі асінавых плашак.

◈ Асіна выкарыстоўвалася падчас розных святкаванняў як надзейны абярэг гаспадарчых пабудоў і свойскай жывёлы. Напрыклад, на Юр'я, у дзень першага выгану жывёлы ў поле, гаспадыня сцябала карову галінкамі вярбы, а вось каб перасцерагчы яе ў купальскую ноч, у дзверы хлява ўтыкалі некалькі галінак асіны.

◈ Праз асінавае галлё, пакладзенае перад парогам хлява, павінен быў пераступіць конь, якога толькі што купілі і прывялі дадому. У Гарадоцкім раёне, перад тым як выганяць худобу ў двор, у парозе хлява ўбівалі асінавы кол, каб засцерагчы статак ад вядзьмацкіх чараў.

З асіны рабілі барану, якой абганялі вёску ў час барацьбы з эпідэміямі.

◈ Цікавы факт: асіна — дрэва з мяккай драўнінай, якая ў той жа час найменш за ўсе астатнія гніе. Працягласць жыцця гэтага дрэва — больш за 100 гадоў. З асіны вырабляюць самыя трывалыя старчакі для брукаванкі.

◈ Калі пакласці асінавае палена ў мех з нягашанай вапнай, яна не будзе вільготнай і не «запарыцца»; калі пакласці кавалак асіны ў цэбар з квашанай капустай — яна не забродзіць і не скісне.

◈ Прыкмячалі: калі на асіне вялікія пупышкі — да ўраджаю ячменю; на асіне шмат «завушніц» — да ўраджаю аўсу.

---

Даты | Падзеі | Людзі

**14 КАСТРЫЧНІКА**

**1843** год — у Патсдаме адбылася прэм'ера спектакля «Сон у летнюю ноч» паводле п'есы Шэкспіра. Нічога незвычайнага ў гэтым, можа быць, і не было — Шэкспіра і раней вельмі ахвотна ставілі. Адзінае адрозненне ад іншых прэм'ер — музыку да спектакля напісаў 34-гадовы кампазітар Якаб Людвіг Фелікс Мендэльсон-Бартольдзі. Менавіта ў гэты дзень у спектаклі ўпершыню прагучаў «Вясельны марш», знаёмы ўсім, хто бярэцца шлюбам. Першы раз у якасці вясельнага марш Мендэльсона быў выкарыстаны падчас вянчання Дораці Кар'ю і Тома Дэніэла ў царкве св. Пітэра ў Тывертоне (Вялікабрытанія) 2 чэрвеня 1847 г. Аднак шырокую папулярнасць гэты марш набыў праз 15 гадоў — пасля выканання яго 25 студзеня 1858-га на вяселлі прускага караля Фрыдрыха Вільгельма IV і англійскай прынцэсы Вікторыі Адэльгейды, старэйшай дачкі каралевы Вікторыі.

**1860** год — 155 гадоў таму нарадзіўся (г. Гарадок, цяпер Віцебская вобласць) Ангел Іванавіч Багдановіч, удзельнік рэвалюцыйнага руху, публіцыст, крытык, рэдактар. З 1880 года вучыўся на медыцынскім факультэце Кіеўскага ўніверсітэта; быў удзельнікам гуртка народавольцаў, вёў прапаганду сярод рабочых. У 1883 г. высланы ў Ніжні Ноўгарад, дзе пазнаёміўся з пісьменнікам В. Караленкам і стаў супрацоўнічаць у шэрагу волжскіх выданняў. З 1893 года ў Пецярбургу стаў адным з арганізатараў нелегальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай партыі «Народнае права». У 2-й палове 1890-х гг. перайшоў на пазіцыі «легальнага марксізму». У 1895-1906 гг. рэдактар часопіса «Мир Божий», на старонках якога прапагандаваў неабходнасць адукацыі для шырокіх слаёў народа, ідэі В. Бялінскага, М. Дабралюбава, М. Чарнышэўскага, выступаў у абарону рэалістычнай літаратуры дэмакратычнага кірунку. Пісаў пра падзеі рэвалюцыі 1905-1907 гадоў. Пасля публікацыі яго артыкула пра снежаньскае ўзброенае выступленне пецярбургскіх рабочых 1905 года часопіс быў забаронены. З 1906-га рэдагаваў часопіс «Современный мир». Памёр у 1907 годзе.

**1899** год — нарадзіўся (вёска Слабада-Кучынка, цяпер Капыльскі раён) Адам Антонавіч Бабарэка, беларускі пісьменнік і крытык. У 1927 годзе скончыў БДУ. У 1921-22 гадах — палітработнік у Чырвонай Арміі, у 1926-29 гг. — выкладчык беларускай мовы і літаратуры ў Камуністычным універсітэце Беларусі, з 1928-га на кафедры беларускай літаратуры БДУ. Вядомы як адзін з арганізатараў і кіраўнікоў літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» і «Узвышша». Распрацоўваў метадалагічныя праблемы літаратуразнаўства і эстэтыкі, прынцыпы народнасці, сацыяльнай і эстэтычнай каштоўнасці літаратуры, даследаваў гісторыю беларускай літаратуры, творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, У. Дубоўкі, К. Чорнага і інш. У 1930 г. рэпрэсаваны. Памёр у 1938-м. Рэабілітаваны ў 1957 г.



Было сказана

**Ніна ТАРАС, празаік, паэтка:**
*Таму крыніца чыстая заўжды,*
*Што не стаіць яна на месцы.*

---

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.35 | 18.16 | 10.41 |
| Віцебск — | 7.26 | 18.03 | 10.37 |
| Магілёў — | 7.25 | 18.06 | 10.41 |
| Гомель — | 7.19 | 18.05 | 10.46 |
| Гродна — | 7.49 | 18.31 | 10.42 |
| Брэст — | 7.48 | 18.34 | 10.46 |

**Месяц**

***Маладзік 13 кастрычніка. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

**Імяніны**

***Пр.** ПАКРОВЫ (Пакроў Маці Божай).*
***К.** Маргарыты, Бярнарда.*



Фота Алены ДАРАШКЕВІЧ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

З кнігі водгукаў у кавярні:

«Дзякуй, што атруцілі. За пяць дзён скінуў 10 кілаграмаў, кінуў піць, курыць і бадзяцца».

**Жыццё занадта кароткае, каб марнаваць яго на дыеты, сквапных мужчын і дрэнны настрой.**

Кожную раніцу.

Я: — Мне сапраўды трэба ісці.

Ложак: — Але, дзетка, на вуліцы так холадна!

**Маленькі Пеця, ведаючы, што яго пакараюць, загадзя паставіў камп'ютар у кут.**




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.654. Індэкс 63850. Зак. № 4098.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 кастрычніка 2015 года.